лам мясцовай лексікі, якая надае яму рэгіянальную адметнасць.

*Літ.*: Карский Е.Ф. Белорусы. Т. 3, ч. 1. М., 1916; Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка. Кн. 4. Народная проза. Мн., 2002.

*К.П.Кабашнікаў.*

**СТЭ́ЛЬМАХ** Дзіяна Уладзіміраўна (н. 13.7.1939, Мінск), тэатразнавец. Кандыдат мастацтвазнаўства (1984). Скончыла БДУ (1961), Бел. тэатральна-мастацкі інстытут (1967). Працавала ў выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя» (1968—81, 1986—94), Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі (1981—86). У традыцыях нар. смехавай культуры даследавала нар. драму ў Беларусі.

*Тв.*: Сцэнічнае ўвасабленне народнай драмы // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1981. № 2; Узнікненне і развіццё народнай драмы на Беларусі // Там жа. 1982. № 6.

**СУБО́РНАЯ СУБО́ТА**, дзявочнік, дзявічкі, паненскі вечар, вяночкі, апошні вечар перад *Вяселлем*; абрад развітання маладой са сваім дзявоцкім жыццём. Удзельнічалі толькі дзяўчаты:

А паследнюю суботку
Знайшла Манечка работку —
Стала па хатках хадзіці,
Стала дзевачак прасіці: —
Прыдзіце, дзевачкі, прыдзіце
Вы мне вяночак завіце.

У С.с. плялі вянок маладой, рыхтавалі кветкі, запляталі касу маладой, рабілі ёлачку і кветкі для дружыны маладога. Падрыхтоўцы вянка, як сімвала дзявоцкага красавання, надавалі вялікае значэнне. Для вянка выкарыстоўвалі тыя кветкі, якія вырасціла сама дзяўчына — рута, мята, барвенак, каліна, ружа, лілея. Падрыхтаваны вянок хто-небудзь з блізкіх дзяўчыны павінен быў выкупіць. У некаторых мясцовасцях гэта рабіў малады, які са сваёй дружынай прыходзіў пад канец вечара:

Звілі вяночак з барвінку,
Нясі, малады, гарэлку.
Як не выкупіш — не дадзім,
А расшыем — прададзім.

Меў месца рытуал качання вянка, калі дзяўчына каціла яго па стале ў рукі маці. Песні, якія суправаджалі гэтае дзеянне, прасякнуты глыбокім сумам маці, якая аддае роднае дзіця «ў чужую старану, не да роднага татушкі, не да роднай матушкі».

У час С.с. выконваліся песні маты-ву раставання дзяўчыны з дашлюбным жыццём:

Нямножка венчыку на сцяне вісець,
Нямножка мне з дзеўкамі пагуляць.

Менавіта ў гэты вечар дзяўчына ў апошні раз заплятала касу — сімвал дзявоцкасці:

Сягоння ў нас паненскі вечар настаець
Паследні раз млода Манечка
коску запляцець.
Не будзе яе русая каса буяці,
Не будзе яна з девачкамі гуляці.

У песнях дзяўчына просіць маці дазволіць ёй яшчэ пакрасавацца ў вяночку, бо ў чужой сям'і «будзе гора, бо не ў роднай маткі. Трэба позна легчы, раненька ўстаці і ўсю сямейку абуджаці».

У маладога такі абрад называўся Хлапечнікам. Ён быў менш урачысты і адбываўся не паўсюдна:

З суботы на нядзелю у гадзіну
Сабраў Нікіпарка сваю радзіну.
Няхай мая радзіна збярэцца,
Хай маёй гарэлкі нап'ецца.

С.с. — эмацыйна-насычаны абрад, які падрыхтоўваў маладых да пераходу ў сямейнае жыццё і заканчваўся развітаннем дзяўчыны з сяброўкамі, а хлопца з сябрамі «не на адну ноч, а на ўвесь век».

*Дз.Я.Дрозд.*

**СУБО́ТА** (ад старажытнаяўрэйскага sabbath — субота), шосты дзень тыдня. У структуры бел. нар. календара С. — незвычайны дзень у плане сакральна-магічнага напаўнення: нашы продкі быццам па спецыяльным інфармацыйным канале дакраналіся да таямніц Сусвету, наладжвалі кантакты з душамі памерлых сваякоў, звяртаючыся з просьбай аб добрым ураджаі ці шчаслівай долі маладых, якія бралі шлюб. З цягам часу з'явіліся С., якія лічацца днямі памяці і ўшанавання продкаў (Дзяды, Бацькоўскія С.). Суботні рытуальны дыялог з продкамі ўплываў на некаторыя абрадавыя кантэксты ў культуры беларусаў. Верылі, дзіця, якое народзіцца ў С., атрымае ад продкаў незвычайную «спадчыну» — будзе ведаць больш, чым астатнія (можа стаць знахарам або лекарам). Калі дзіця пахрысцяць у С. — пражыве доўгі і шчаслівы век. Забаранялася праводзіць аб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рады, скіраваныя ў будучыню (у першую чаргу — заключэнне шлюбаў). У славянскай нар. традыцыі С. лічылася добрым, лёгкім днём — «жаночым», якому адпавядае цотны лік 6. Адначасова з ёю быў звязаны шэраг забарон і рэгламентацый. У С. наводзілі парадак у хаце і на падворку, лічылі спрыяльным днём для ад'езду ў дальнюю дарогу, не пачыналі адказныя справы, асабліва будаўніцтва (дазвалялася толькі закладваць падмурак новай хаты). Калі тканіна была вытканая ў С., то адзенне з яе шылі толькі для дарослых. Амаль усе абрадавыя падзеі, якія выконваліся ў С. на працягу года, сталі днямі ўшанавання памяці родзічаў. С. на 9-м, 6-м, 5-м і 4-м тыднях перад Вялікаднем лічыцца Дзедавай або Бацькоўскай; на 7-м тыдні пасля Вялікадня — Траецкая, Духава, Стаўрускія, Стаўроўскія Дзяды; С. або пятніца перад Успеннем Багародзіцы (28 жніўня) — Спасаўскія Дзяды; напярэдадні ўшанавання Дзімітрыя Салунскага (8 лістапада) — Змітрава, Памінальная, Бацькоўская С.; у 3-ю С. пасля Пакрова ў (14 кастрычніка) — Восеньскія, або Дзмітраўскія Дзяды; напярэдадні дня ўшанавання памяці святога Архістратыга Міхаіла (21 лістапада) — Бабы, Міхайлаўскія Бабы; напярэдадні Піліпаўскага посту (пачынаўся 28 лістапада) — Піліпаўскія, Раздзвяныя Дзяды. Некаторыя з С. маюць інш. рытуальнае напаўненне: на 8-м тыдні перад Вялікаднем — працяг святкавання Масленіцы; на 7-м — Суборная; на 3-м — «Дзякаванне Найсвяцейшай Багародзіцы», Мезіна, Пахавальная; апошні дзень перад Вялікаднем — Вялікая, Чырвоная, Велікодная; С. Велікоднага тыдня — Светлая сядміца — замыкала першы святочны тыдзень.

*Літ.*: Климишин И.А. Календарь и хронология. М., 1985; Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. Зямля стаіць пасярод свету... Мн., 1999. С. 438, 550; Крук Я., Котович О. Колесо времени: традиции и современность. Мн., 2003. С. 72—98.

*А. В. Катовіч.*

**«СУДДЗЯ ПРА́ВЕДНЫ»**, міжнародны казачны сюжэт СУС — 332*****. Народ выбірае суддзю, якому выколваюць вочы, каб судзіў, не зважаючы на асобы. Справядліва рассудзіўшы жабу з вугром, суддзя зрабіўся відушчы, ён выкрывае святых і Бога і прызнае толькі непрадузятасць смерці, якая вядзе яго ў рай. Бел. варыянт апублікавалі Е.Раманаў і У.Дабравольскі. У тэксце апошняга падкрэсліваюцца сацыяльныя матывы, выкрываецца несправядлівасць, якая панавала ў грамадстве і падтрымлівалася царквой. «Свет роўны і глядзім мы роўна, другі чалавек сыты, адзеты і абуты, а ў другога нет нічога», — з дакорам гаворыць «С.п.» Богу. Яшчэ больш рэзка ён крытыкуе Міколу Ўгодніка, якому падабаюцца вялікія тоўстыя свечкі, што ставяць у царкве багатыя людзі, «а бедны чалавек саб'ецца і паставіць свечку: тады ты не смотрыш на яго прама, вочы зажмурыш, бровы апушчаеш... не смотрыш ты прама на нас бедных...». Падобныя творы даволі актыўна бытавалі ў народзе, адлюстроўвалі паступовы рост грамадскай свядомасці сялянскіх мас, асуджэнне імі сацыяльнай няроўнасці і несправядлівасці.

*Літ.*: Сацыяльна-бытавыя казкі. Мн., 1976; Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка. Кн. 4. Народная проза / Уклад. К.П.Кабашнікаў, А.С.Фядосік, А.В.Цітавец. Мн., 2002.

*К. П. Кабашнікаў.*

**СУ́ДНІК** Мікалай Іванавіч (5.3.1901, г. Вілейка Мінскага р-на — люты 1973), майстар по вырабе гармонікаў. З 1945 майстар арцелі «Чырвоны партызан» па рамонце гармонікаў, баянаў, акардыёнаў (у пачатку 1950-х г. рэарганізавана ў фабрыку музычных інструментаў) у Маладзечна. Захоўваў традыцыі вырабу гармонікаў у Беларусі і ўкараніў іх у вытворчы працэс. Займаўся эксперыментамі па ўдасканаленні гукавых якасцей гармоніка. Распрацаваў рэгістроўку галасавога апарата, механіку правай і левай клавіятур і інш. Гармонікі С. гучаць у прафесійных і аматарскіх калектывах, захоўваюцца ў прыватных калекцыях музыкантаў, дзяржаўных музеях Беларусі.

*А.В.Скорабагатчанка.*

**СУПІ́НСКІ** Антон Канстанцінавіч (канец 19 — пачатак 1950-х г.), археолаг, этнограф, збіральнік бел. фальклору. Працаваў у Ленінградзе, разам з А.Сержпутоўскім фарміраваў, папаўняў фонды этнаграфічнага аддзела ў Рускім музеі. У 1923 праводзіў археалагічныя раскопкі на Віцебшчыне, даследаваў магільнік каля вёскі Лятох, выявіў 12 курганаў, запісаў звязаныя з імі легенды. У 1925 удзельнічаў у працы Віцебскай акруговай краязнаўчай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ